# РОЛЯ І ЗНАЧЭННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ Ў КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ РЭГІЁНА

**С. М. Ганчар,**
*дырэктар Вілейскага краязнаўчага музея*

Цяжка пераацаніць ролю краязнаўчага музея ў культурным жыцці рэгіёна, як і ўвогуле музея ў жыцці сучаснага грамадства. У апошнія дзесяцігоддзі ў Беларусі назіраецца тэндэнцыя да росту наведванняў музея. Гэтая з'ява звязана з пашырэннем «аўдыторыі» і відазмяненнямі традыцыйных форм работы музеяў, выкарыстаннем інавацыйных метадаў работы, якія абапіраюцца на пераасэнсаванне месца, ролі і функцый музея ў сацыякультурным развіцці грамадства. Сёння музей перастае быць проста зборам прадметаў для вузкага кола знаўцаў. Сучасны музей – гэта культурны цэнтр, які вырашае задачу аптымальнага і выразнага прадстаўлення сваіх калекцый.

У пачатку XXI ст. за музеямі паўсюдна прызнаны статус асабліва значных устаноў культуры, якія выконваюць функцыі захавання гісторыка-культурнай спадчыны і трансляцыі гістарычнага і культурнага вопыту пакаленняў сродкамі выяўлення, дакументавання, вывучэння і рэпрэзентацыі прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Безумоўна, музей адыгрывае таксама і велізарную навукова-даследчую і адукацыйную ролю, прадастаўляючы доступ да ведаў, да інтэлектуальнай спадчыны, важнай для разумення мінулай і сучаснай сацыяльнай эвалюцыі.

Не першае дзесяцігоддзе адным з самых дзейсных спосабаў знаёмства з рэгіянальнай культурай, мясцовымі гістарычнымі, этнаграфічнымі асаблівасцямі і традыцыямі застаецца наведванне краязнаўчага музея. У савецкі перыяд музеі развіваліся ў аднолькавым напрамку і былі падобныя адзін да аднаго. Гэты час прайшоў, музеі ідуць па ўласным шляху, аддаючы перавагу сваім мясцовым асаблівасцям.

Вельмі важна, што распрацоўка пытанняў нацыянальнай і культурнай самабытнасці адбываецца ў рамках інтэнсіўнай пераарыентацыі музейнай сферы з традыцыйных напрамкаў дзейнасці на вырашэнне складаных сацыяльных пытанняў узаемадзеяння музеяў і грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вілейскі краязнаўчы музей ідзе таксама па шляху пошуку новых форм і метадаў дзейнасці і прыцягнення ўсё больш шырокага кола наведвальнікаў. Пры музеі існуе студыя народных абрадаў і традыцый «Краявід», якой ў 2011 г. Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь прысвоена званне «народны аматарскі калектыў». Дарэчы, адзіны калектыў са званнем, які існуе на базе музея, сярод паўтары сотні музеяў краіны.

У музеі распрацоўваюцца музейна-адукацыйныя праграмы, якія ахопліваюць як мага большае ўзроставае кола мэтанакіраванай аўдыторыі, пачынаючы з малодшых груп дзіцячых садкоў і заканчваючы дарослымі. Такая практыка паказвае, што музей можа выхоўваць будучых наведвальнікаў сам.

Даўно ўжо вядома, што для таго, каб наведвальнікі маглі ўспрымаць тую ці іншую выставу, асабліва гэта датычыцца выстаў сучаснага мастацтва, перфоманса, трэба падрыхтаваць глебу, адукаваць наведвальніка. Да сённяшняга часу пляцоўкі па сучасным мастацтве былі толькі ў Мінску і ў асноўным усе маштабныя і найбольш значныя арт-падзеі адбываліся таксама тут. Вілейскі краязнаўчы музей у такіх умовах пайшоў на эксперымент. Было вырашана зрабіць звычайны краязнаўчы музей унікальнай прасторай, амаль старажытнагрэчаскім топасам, дзе могуць аб’яднацца сучаснае мастацтва і яго глядач. Быў распрацаваны цыкл лекцый па сучасным мастацтве «ART-Vileyka», дзе раз на месяц у выставачную залу Вілейкі прыязджаюць людзі, якія з’яўляюцца асноўнымі дзеючымі фігурамі на сучаснай арт-пляцоўцы Беларусі. Можна сказаць, музей бярэ на сябе клопат аб тым, каб вярнуць гледачу права на час для асэнсавання сябе і наваколля, што з’яўляецца галоўнай мэтай лекцый.

Яшчэ адным эксперыментам музея стала правядзенне «Ночы музеяў» як вялікага маштабнага фестывалю пад адкрытым небам, дзе, акрамя наведвання музея і выставачнай залы, гледачы могуць акунуцца ў тэатралізаваныя гістарычныя падзеі, паўдзельнічаць у флэш-мобах, паглядзець вогненнае шоу, выступленні беларускіх зорак, сучасных музыкантаў у абрамленні высокай якасці гуку і святла. Такія фестывалі прайшлі ўжо двойчы і сталі па-сапраўднаму падзеямі года, тым больш што колькасць наведвальнікаў у некалькі тысяч гаворыць сама за сябе.

Займаючыся актыўнай выставачнай і выдавецкай дзейнасцю, рэалізуючы навукова-даследчую і адукацыйную функцыі, рэгіянальныя музеі сталі тым сувязным звяном у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміравання адзінай культурнай прасторы і тым цэнтрам культурнага жыцця рэгіёна, які садзейнічае развіццю свайго, мясцовага.

Час паказвае, што рэгіянальныя музеі – добрая стартавая пляцоўка для распрацоўкі культурных брэндаў. І гэта мы павінны асэнсаваць, бо менавіта на сваіх, мясцовых брэндах можна развіваць не толькі турыстычную інфраструктуру рэгіёна, але і эканамічную, інвестыцыйную, прамысловую сферы.

Такім чынам, рэгіянальныя музеі сталі неад'емнай часткай культурнага жыцця рэгіёна, садзейнічаючы вырашэнню пытанняў, якія стаяць перад грамадствам, – асвета, эстэтычнае выхаванне, развіццё духоўнай культуры, перадача вопыту пакаленняў, самавызначэнне ў межах этнасаў, краін і асобных лакальных тэрыторый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ